**Нагода.** Тэматычная выстаўка з нагоды 455-годдзя прыняцця Статута Вялікага Княства Літоўскага 1566 года адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У лістападзе 1551 года вялікі князь Жыгімонт Аўгуст даў згоду на стварэнне заканадаўчай камісіі ў мэтах удасканалення Статута 1529 года. Кіраўнікам камісіі стаў Мікалай Радзівіл Чорны, работа над Статутам доўжылася больш за дзесяць гадоў. Другі Статут налічваў 14 раздзелаў і 267 артыкулаў. Дакумент напісаны на беларускай мове, зразумелай простаму насельніцтву, некалькі разоў перакладаўся на лацінскую, польскую, нямецкую, рускую і іншыя мовы. Вядомы 58 рукапісных тэкстаў Статута. Ён доўгі час служыў прыкладам і ўзорам сістэматызацыі заканадаўства, адзначаюць у НББ. Многія палажэнні дакумента апярэджвалі час і мелі выразны праграмны характар, арыентаваны на будучыню, што выводзіла яго ў лік самых прагрэсіўных еўрапейскіх законаў свайго часу.